УДК 808.26: 001

Я. Г. Міляшкевіч, дацэнт

# ВЫХАВАЎЧАЯ РАБОТА СА СТУДЭНЦКАЙ МОЛАДДЗЮ ПРАЗ ДЗЕЙНАСЦЬ ТАВАРЫСТВА БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ ІМЯ Ф. СКАРЫНЫ

Activity of Company of the Byelorussian language of a name of F.Skoriny at university on expansion of sphere of the use of the Byelorussian language is described. The basic forms of activity among students are round-table discussions, thematic lectures, excursions.

Родная мова для любога чалавека з'яўляецца асновай нацыянальнага светапогляду і патрыятызму, яна захоўвае і передае традыцыі свайго народа. Сутнасць мовы ў здольнасці адэкватна асэнсаваць рэальны культурна-гістарычны досвед народа.

Адна з рэальных праблем беларускай свядомасці – гэта недастатковае валоданне беларускай мовай значнай часткай беларусаў. З гэтай нагоды на Беларусі ў 1989 г. было створана грамадскае аб'яднанне – Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны (ТБМ), а ва універсітэце – суполка таварыства. Захаванне і развіццё беларускай мовы – гэта выратаванне беларускага этнасу ад рэальнага этнацыду. К. Ушынскі пісаў: «Страта мовы для народа раўназначная знішчэнню этнасу». «Не можа быць скансалідаванай нацыі пры адсутнасці базавага элемента кансалідацыі – мовы» (Н. Назарбаеў, 2004 г.).

У практычным плане важна стымуляваць імкненне да свядомага засваення беларускай мовы – адной з прыгажэйшых і распрацаваных моў свету.

Сваё арганічнае месца ў патрыятычным выхаванні студэнтаў у Беларускім дзяржаўным тэхналагічным універсітэце займае дзейнасць Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны, асноўнымі напрамкамі якой з'яўляецца пашырэнне сферы ўжывання беларускай мовы, азнаямленне студэнцкай моладзі з вытокамі і развіццём мовы, гісторыі, культуры, з дзеячамі навукі, культуры і мастацтва Беларусі. У сувязі з 60-годдзем Вялікай Перамогі асобае значэнне набывае гераічнае мінулае.

Важную ролю выконваюць выкладчыкі універсітэта – сябры Таварыства беларускай мовы, больш за 50 якіх вядуць выкладанне на роднай мове. За апошні час з іх удзелам напісана звыш 20 падручнікаў на беларускай мове.

Работа Таварыства беларускай мовы сярод студэнтаў пачынаецца з нефармальных бясед на першых курсах. Найбольшую актыўнасць набывае дзейнасць Таварыства сярод студэнтаў 1-га курса лесагаспадарчага факультэта, дзе шэраг дысцыплін выкладаецца на беларускай мове. Штогод утвараецца суполка з 25–30 чалавек, якая далучаецца да работы сяброў старэйшых курсаў. У 2004 г. была зарэгістравана суполка «Маладзік», работа якой у бягучым годзе папоўнілася за кошт новых сяброў – студэнтаў 1-га курса. На іншых факультэтах праводзяцца тэматычныя сустрэчы са студэнтамі пераважна без утварэння суполак. Каардынатарам дзейнасці з'яўляецца старшыня ТБМ універсітэта дацэнт Міляшкевіч Я.Г.

Асноўнымі формамі работы са студэнцкай моладдзю з'яўляюцца тэматычныя сустрэчы, дыспуты, экскурсіі. Найбольш даступнымі і цікавымі з'яўляюцца *бяседы за круглым сталом*, якія прадугледжваюць папярэднюю падрыхтоўку студэнтамі неабходных матэрыялаў. Тэматыка бясед наступная.

1. Ф. Скарына – беларускі гуманіст, асветнік, першадрукар.
2. Вытокі беларускай мовы і яе развіццё.
3. Беларуская мова – адна з распрацаваных і прыгожых моваў свету.
4. Матчына мова і беларуская паэзія.
5. Янка Купала і яго паэтычная спадчына.
6. Мой родны кут, як ты мне мілы.
7. Хто я такі, якім сябе бачу ў жыцці.
8. Мой радавод: мае бацькі і продкі.
9. Удзел маіх родных у вызваленні Беларусі ад фашысцкіх захопнікаў.

У час такіх бясед студэнты прадметна знаёмяцца з гістарычнай спадчынай беларусаў, расказваюць аб сваёй малой радзіме, сваіх родных, сябе, вызначаюць сваё месца ў жыцці.

Цікавасць у моладзі выклікаюць *дыспуты і бінарныя лекцыі* з запрашэннем выкладчыкаў кафедраў гісторыі Беларусі і беларускай мовы. Тэматыка дыспутаў наступная.

1. Беларусь сінявокая: матэрыяльная і духоўная культура беларусаў.
2. Як ты ведаеш гісторыю Беларусі?
3. Як ты ведаеш беларускую літаратуру і паэзію?

Такія дыспуты даюць магчымасць даведацца студэнту пра тое, што беларусы маюць выдатную тысячагадовую гісторыю, маюць сваю нацыянальную адметнасць, могуць ганарыцца сваёй гістарычнай спадчынай.

Намаганнямі рэктарата і ТБМ у 1993 г. у зале Савета універсітэта, упрыгожанага гістарычнымі вітражамі, была створана *галерэя* «Вялікія навукоўцы-беларусы» (мастак

Т. Кашкурэвіч, укладальнік Я. Міляшкевіч), якая ўключае ў сабе 20 партрэтаў славутых сыноў і дачок зямлі беларускай, што стварылі гонар і славу як сваёй нацыі, так і народам іншых краін, з'яўляюцца заснавальнікамі навуковых напрамкаў, увайшлі ў гісторыю сусветнай навукі. Дастаткова назваць імёны *Казіміра Семяновіча,* першага ракетчыка Еўропы, *Якуба Наркевіча-Ёдкі*, фізіка-вынаходніка спосабу электраграфіі, *Яўхіма Карскага*, заснавальніка беларускай філалогіі, *Барыса Кіта*, распрацоўшчыка першых касмічных сістэм. Па матэрыялах галерэі для сяброў суполкі, шэрагу кураратарскіх груп праводзіцца лекцыя пра славутых беларускіх навукоўцаў. Як бінарная лекцыя выкарыстоўваецца на занятках беларускай мовы для студэнтаў спецыяльнасці «Выдавецкая справа», а таксама для аспірантаў універсітэта (В. Кузьміч, Я. Міляшкевіч).

У холе універсітэта ў 1990 г. створаны *Скарынаўскі мемарыял*, які ўключае ў сябе скульптурны партрэт Ф. Скарыны, 2 вітражы – гербы Полацка і Наваградка, мастацкую размалёўку эпохі Скарыны на 4-х сценах. Тут звычайна праводзяцца сустрэчы са студэнтамі, праводзіцца лекцыя-агляд гістарычнага перыяду і творчай дзейнасці Ф. Скарыны.

Асобную форму набыла нядзельная *вандроўка* па мясцінах ракі Вяча пад Мінскам, дзе жыў і тварыў Янка Купала, з наведваннем мемарыяла і музея «Акопы» (кіраўнік – сябра ТБМ Дзядзюля П. В.). За дзень студэнты праходзяць па маляўнічых мясцінах да 30–35 км, вядуць дарожныя нататкі, якія затым апрацоўваюцца і абмяркоўваюцца за круглым сталом. Цікавыя нататкі напісаў студэнт Віталь Кучынскі, у тым ліку пра дзейнасць партызан у гэтым раёне. Важнае месца займаюць *экскурсіі* па гістарычнай частцы Мінска, па верхняму і ніжняму гораду, месцах баявой славы, наведванне музеяў М. Багдановіча, Вялікай Айчыннай вайны.

Бяседы за круглым сталом, дыспуты, наведванне мемарыялаў выклікаюць жывую зацікаўленасць студэнтаў. Пасля лекцыі «Славутыя беларускія навукоўцы» у галерэі студэнты ў сваіх *водгуках* пісалі: «У нашай свядомасці нарадзіліся патрыятычныя пачуцці, мы адчулі гонар за сваю Бацькаўшчыну» (Ладыгіна Марыя, Махіна Люба, Бурэц Мікола); «Мяне ахапіла хваля самасвядомасці, я выйшла з лекцыі з новымі поглядамі, я ганаруся, што я беларуска» (Трусевіч Вера); «Я ніколі раней не адчувала такога пачуцця гонару і любові да сваёй Радзімы, я быццам вырасла ў сваёй душы» (Лебедзева Алена); «Пакуль мы не навучымся разумець і цаніць нашу спадчыну, мы не станем сапраўднымі беларусамі» (Гайдукова Марыя); «Я задумалася над тым, ці змагу я быць такой самаахвярнай, як людзі навукі – нашы славутыя землякі» (Лаўроўская Алена, Каржусевіч А.); «Веданне гісторыі беларускай навукі вельмі патрэбна: чалавек становіцца больш развітым, індывідуальна прыгожым; гэты момант у маім жыцці застанецца надоўга ў памяці» (Сазон Кацярына).

Выпрацоўка нацыянальнай самасвядомасці, пачуцця гонару за Радзіму, пашырэнне сферы ўжывання беларускай мовы, далучэнне студэнцкай моладзі да нацыянальных каштоўнасцяў, абуджэнне цікавасці да гісторыі і навукі беларусаў – вось галоўная мэта дзейнасці ТБМ ва універсітэце.